УДК 325/2(450)

# РЭЛІГІЙНЫ ФАКТАР
# У ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ

**Коваль Вольга Уладзіміраўна**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны рэлігійнай гісторыі беларускага замежжа ў міжваенны перыяд, калі адбываўся працэс станаўлення нацыянальнай дыяспары. Найбольш значныя рэлігійныя цэнтры беларускіх эмігрантаў сфарміраваліся ў Італіі, Чэхаславакіі, ЗША. Ксяндзы-беларусы аказалі непасрэдны ўплыў на працэс станаўлення рэлігійнай беларускай дыяспары ў 1920-я гг., на яе кансалідацыю і актыўную міжнародную дзейнасць.*

Даследаванне рэлігійнай гісторыі беларускай нацыі не павінна абмяжоўвацца толькі канфесійнымі характарыстыкамі метраполіі, для поўнай карціны адлюстравання працэсаў неабходна таксама разглядаць дзейнасць святароў з ліку беларусаў замежжа. Канфесіі для эмігрантаў нярэдка выконвалі этнічна-нацыянальную ролю, фарміравалі партнёрскія адносіны з тытульнай нацыяй і іншымі народамі, спрыялі духоўнаму развіццю асоб.

Міжваенны перыяд стаў часам фарміравання беларускай дыяспары, калі дакладна афарміўся працэс інстытуалізацыі грамадскага палітычнага жыцця нацыянальнай супольнасці замежжа. Спецыялісты ў галіне эмігрантазнаўства беларускую дыяспару адносяць да тыпу “новых” дыяспар. Адметнасцю рэлігійных арганізацый эмігрантаў ў працэсе арганізацыі нацыянальнай ідэнтычнасці стала імкненне да развіцця духоўна-асветніцкай дзейнасці. Праца рэлігійных устаноў была накіравана на стварэнне ўмоў для задавальнення эмігрантамі іх духоўных патрэб ва ўмовах іншакультуранага асяроддзя, этнарэлігійная самаідэнтыфікацыя асоб дапамагала ім у працэсе сацыяльна-псіхалагічнай адапатацыі.

Беларуская супольнасць замежжа, як і іншыя славянскія дыяспары, была прадстаўлена некалькімі хрысціянскімі цэрквамі, хаця асноўную частку аб’яднанняў эмігрантаў складалі нерэлігійныя (свецкія) арганізацыі. Беларусы замежжа ў асноўным падзяляліся на асоб праваслаўнага веравызнання і на католікаў. Пры даследаванні развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці дыяспары неабходна падкрэсліць, што адкрыта да нацыянальных пачуццяў веруючых заклікалі беларускія ксяндзы. Пазіцыя каталіцкіх святароў тлумачыцца іх рэакцыяй на апалячванне і акаталічванне беларускага насельніцтва ў Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. стала часткай Другой Рэчы Паспалітай.

Тэрміналогія дыяспаразнаўства працягвае развівацца і пашырацца новымі паняццямі і дэфініцыямі. У навуковым звароце паступова замацоўваецца тэрмін “нацыянальная рэлігійная дыяспара”. Напрыклад, у сваіх публікацыях па гісторыі канфесій А. Калодны [1, с. 411] выкарыстоўвае і абгрунтоўвае паняцце “ўкраінская рэлігійная дыяспара”.

У 1920-я гг. у іншаэтнічным асяроддзі паступова адбываецца працэс фарміравання беларускай рэлігійнай дыяспары, якая была не вельмі значнай па колькасці эмігрантаў, яна абапіралася ў асноўным на грамадскую дзейнасць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

эмігрантаў-католікаў. У міжваенны час асноўная частка эміграцыйнай хвалі беларускага насельніцтва складалася з жыхароў Заходняй Беларусі. Польскія ўлады мэтанакіравана ажыццяўлялі ідэалагічную работу праз структуры каталіцкага касцёла з мэтай паланізацыі нацыянальных меншасцей. Грамадская і палітычная пазіцыя беларускіх ксяндзоў, якія публічна заяўлялі пра рэлігійную дыскрымінацыю ў Заходняй Беларусі, стала своеасаблівым адказам на апалячванне нацыянальных меншасцей.

Асноўнымі цэнтрамі беларускага рэлігійнага жыцця сталі Італія, Чэхаславакія, ЗША. Адметнасць Італіі ў тым, што гэта краіна ў міжваенны перыяд была цэнтрам багаслоўскай асветы для ксяндзоў-беларусаў. Беларускія студэнты набывалі адукацыю ў Папскім Грыгарыянскім універсітэце і Папскім усходнім інстытуце ў Рыме.

Беларусы Італіі вылучаліся сваёй актыўнай працай на міжнародным узроўні, смелай арганізатарская ініцыятывай і цікавымі праектамі для рэлігійнага жыцця замежжа. У 1924 г. беларускія ксяндзы ў Рыме спрабавалі арганізаваць нацыянальную вышэйшую каталіцкую ўстанову, пра што захаваліся звесткі на старонках беларускамоўнай віленскай газеты “Сын Беларуса” [2, с. 1]. Нягледзячы на падтрымку нямецкага пасольства пры Ватыкане, Беларуская духоўная семінарыя ў Рыме так і засталася адукацыйным праектам. Спробы стварэння беларускіх універсітэтаў для эмігрантаў у Чэхаславакіі і Літве таксама не скончыліся поспехам для нацыянальнай супольнасці. Ініцыятывы беларусаў-католікаў рэгулярна сустракалі адкрытую крытыку з боку польскіх ксяндзоў, таму семінарыя для беларусаў таксама была раскрытыкавана. Для арганізацыі ўстановы адукацыі беларусам не хапіла фінансавых сродкаў, адукацыйнага вопыту і падтрымкі з боку Ватыкана.

У 1926 г. беларускія студэнты, якія вучыліся ў Рыме, дабіліся аўдыенцыі ў Папы Рымскага Пія XI [3, с. 6], ксяндзы імкнуліся ўзняць пытанне рэлігійнай дыскрымінацыі беларускіх католікаў у Другой Рэчы Паспалітай на вышэйшым узроўні Ватыкана. Грамадская актыўнасць белаусаў Італіі рэгулярна дэманстравалася на старонках беларускамоўнай віленскай прэсы. Матэрыялы газет і часопісаў міжваеннага часу сталі асобнай групай гістарычных крыніц па тэме рэлігійнага жыцця беларусаў замежжа. Шырока адлюстравана супрацоўніцтва ксяндзоў беларусаў з Аб’яднаннем беларускіх студэнцкіх арганізацый з цэнтральным офісам у Празе і Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыяй. Міжнародная дзейнасць для беларускіх ксяндзоў дазваляла ім уздымаць праблемы рэлігійнай, культурнай і палітычнай дыскрымінацыі беларускага насельніцтва з боку польскіх улад.

Рэлігійнае жыццё нацыянальнай дыяспары ў ЗША звязана з дзейнасцю ксяндза Янкі Тарасевіча, які праводзіў набажэнствы на беларускай мове для беларусаў Амерыкі. Ксёндз Я. Тарасевіч лічыў, што для нацыянальнай супольнасці ЗША неабходна адчыніць беларускі касцёл, таму актыўна займаўся яго арганізацыяй у 1920-я гг. у Чыкага, дзе кампактна пражывалі беларускія эмігранты. У 1927 г. ксёндз Я. Тарасевіч арганізаваў выданне беларускага каталіцкага часопіса ў Нью-Йорку пад назвай “Праўда” [4, с. 3]. Разумеючы важнасць перыядычнага выдання для нацыянальнай супольнасці, беларускі ксёндз сам стаў яго рэдактарам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Каталіцкае студэнцтва ў Празе ўзначаліў Ф. Грышкевіч. Беларусы ў Чэхаславакіі спрабавалі арганізаваць Беларускі каталіцкі студэнцкі гурток, каб рыхтаваць ды друку і выдаваць рэлігійныя перыядычныя выданні, пра што ў 1927 г. апублікавала матэрыял віленская газета "Беларуская Крыніца" [5, с. 3]. Зразумела, што стварэнне і рэгістрацыя нацыянальнай арганізацыі за мяжой была доўгай і складанай справай, таму не ўсе праекты беларусаў былі рэалізаваныя.

Беларускае каталіцкае студэнцтва ў Італіі і Чэхаславакіі падтрымлівала сталыя кантакты з Югаслаўскай Каталіцкай лігай, а харвацкія каталікі на міжнародным узроўні абаранялі пазіцыі беларусаў у барацьбе з рэлігійнай дыскрымінацыяй у Заходняй Беларусі. Ксяндзы-беларусы адкрыта заяўлялі пра ігнараванне польскімі ксяндзамі нацыяльных пачуццяў беларускага насельніцтва Другой Рэчы Паспалітай, што знаходзіла падтымку ў іншых славянскіх народаў.

Такім чынам, у 1920-я гг. пачынаецца працэс фарміравання беларускай рэлігійнай дыяспары, асноўная роля ў якім належыла беларускім ксяндзам. Каталіцкія праекты замежжа спрыялі развіццю нацыянальнай ідэнтычнасці беларускай супольнасці эмігрантаў, стымулявалі іх грамадскае жыццё, кансалідавалі дыяспару ў палітычнай барацьбе супраць дыскрымінацыі польскіх улад.

**Літаратура**

1. Колодний, А. Історичне покликання української релігійної діаспори / А. Колодній // Світове українство як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті: зб. Матер. Четвертої Мінар. наук.-практ. конф. – Львів: Видавництво Львівської політехніки, 2013. – С. 413–418.
2. Беларуская духоўная семінарыя ў Рыме // Сын Беларуса. – 1924. – № 35. – С. 1.
3. Papież Pius XI i Belarusy // Bełaruskaja Krynica. – 1927. – № 3. – S. 6.
4. Biełarusy ŭ Amerycy // Bełaruskaja Krynica. – 1927. – № 22. – S. 3.
5. Z studenskaha žyccia // Bełaruskaja Krynica. – 1927. – № 36. – S. 3.

УДК 93/94

## МОГИЛЕВСКИЙ ПОГРОМ В ЧЕРЕДЕ ПОГРОМОВ 1903–1904 гг.

**Ковтун Андрей Александрович**
Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова
(г. Могилев, Беларусь)

*В статье рассматривается погром, произошедший в Могилеве в октябре 1904 г. Анализируются его причины и последствия, сравниваются различные аспекты могилевского и гомельского погрома.*

В период правления Николая II произошло множество погромов еврейского населения. В частности, во время православной Пасхи 1899 года, с 19 по 21 апреля произошёл трёхдневный погром в Николаеве. 6–7 апреля 1903 года произошёл погром в Кишинёве, который был спровоцирован антисемитскими статьями в газете «Бессарабец». Министра внутренних дел В.К. Плеве прямо обвиняли в организации этого погрома, и его заявления о том, что «евреев надо проучить» были широко известны. Печать многих стран писала, что погром был организован по неявному согласию правительства [1, с. 96].

После этого события еврейская молодежь в различных регионах начала организовывать самооборону от возможных погромов, несмотря на противодей-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова